Газета заснавана ў 1938 годзе. Аднаўлена ў 1997 годзе.

МАСАВА-ПАЛІТЫЧНЫ ШТОТЫДНЁВІК

Газета Слонімская

№13 (303) 27 сакавіка — 2 красавіка 2003г. Наклад 12.250 экз. Кошт 380 руб.

«ГАЗЕТУ СЛОНІМСКУЮ» ЧЫТАЮЦЬ

Слонім,
Зэльва,
Дзятлава,
Масты,
Ваўкавыск,
Шчучын,
Ліда,
Гродна,
Баранавічы,
іншыя гарады Беларусі,
а таксама на HTTP://gs.promedia.by

АНОНС

ВЯСКОВЫЯ ПАКУТЫ

ЗАЧАРАВАНАЕ КОЛА НЕПЛАЦЯЖОЎ

Фота Віталя ГІЛЯ

Гэтыя людзі жывуць у крэдыт

Наведаць вёску Васілевічы, цэнтральную сядзібу калгаса "Перамога", карэспандэнтаў "ГС" падштурхнуў тэлефонны званок калгаснага механізатара Івана Надзюшына.

Мужчына расказаў, што ў бягучым годзе заробак ім яшчэ ўвогуле не плацілі. У сваю чаргу, многія вяскоўцы амаль за тры месяцы завінаваціліся за газ і электрычнасць. У Васілевічах да хатаў жыхароў падведзены прыродны газ, і ў канторы гаргаза людзей папярэдзілі, што калі ў бліжэйшы час яны не заплацяць за скарыстанае паліва, газ ім адключаць.

Аднак, чым плаціць, калі грошы на калгасны рахунак не паступаюць і гаспадарка не можа разлічыцца са сваімі працаўнікамі?

Па словах вяскоўцаў, такое пытанне яны задавалі старшыні калгаса Анатолію Патоцкаму, раённаму кіраўніцтву і (у тэлефоннай размове) журналістам газеты "Советская Белоруссия". Адказу на сваё пытанне яны так і не атрымалі. Адзінае, чаго людзі дамагліся такім чынам — выплаты авансу ў памеры 20 тысяч рублёў.

Працяг на 2 стар.

БУДЕМ ЖИТЬ ПО-ЛЕТНЕМУ

С 30 марта в Беларуси устанавливается "летнее время".

В 2 часа ночи необходимо перевести стрелки на 1 час вперёд.

КУРСЫ ОБМЕНА ВАЛЮТ

в г. Слониме по состоянию на 9[00] 25.03.2003г.

	Покупка	Продажа
"Беларусбанк"		
1 USD	1970	2000
1 EURO	2100	2200
1 ZL	480	510
1 RUR	61	64
оао "Белпромстройбанк"		
1 USD	1970	1995
1 EURO	2110	2180
1 ZL	480	510
1 RUR	61,5	64
"Белагропромбанк"		
1 USD	1970	1995
1 EURO	2080	2160
1 ZL	480	520
1 UAH	340	380
1 RUR	62	64
Нацбанк РБ		
1 USD	1991	
1 EURO	2115,94	
1 RUR	63,45	

АРМІЯ

НАТАЎСКІЯ ІНСПЕКТАРЫ ЗАВІТАЛІ Ў СЛОНІМ

Пакуль адныя амерыканскія ды англійскія ваенныя спрабуюць паставіць на калені Ірак, другія раз'язджаюць па краінах былога сацлагера з інспектарскімі праверкамі.

Вось і ў Слонім у мінулы чацвер завітала група НАТАўскіх ваенных (чатыры амерыканцы і адзін англічанін) з Інспекцыі па кантролю за ўзбраеннем. Палову дня група працавала ў 11 механізаванай брыгадзе.

А пасля абеду ў рэстаране "Паланэз", афіцэры-міжнароднікі, як яны сябе называюць (афіцэр сярод іх быў толькі адзін – маёр Райлі), накіраваліся ў СШ №9. Там яны здолелі пагутарыць на самыя розныя тэмы з хлопцамі-кадэтамі.

Акрамя гэтага, была яшчэ запланавана паездка ў Жыровіцкі манастыр.

Валерый КАВАЛЕНКА

Фота Віталя ГІЛЯ

Фота на памяць. Мы ж не ворагі адзін аднаму...

ЗДАРЭННІ

АСЦЕРАГАЙЦЕСЯ КІШЭННІКАЎ!

Тры жанчыны на мінулым тыдні сталі ахвярамі кішэнных злодзеяў у гарадскіх аўтобусах.

Кішэннікі спрацавалі так, што іх ахвяры нічога і не заўважылі.

ЗНОЙДЗЕНЫ ДВА ТРУПЫ

Нядаўна ў полі каля вёскі Хмяльніца мясцовыя жыхары знайшлі трупы мужчыны і жанчыны.

Пры папярэднім аглядзе прыкметаў гвалтоўнай смерці не выяўлена. Работнікі міліцыі ўстанавілі, што нябожчыкі былі жыхарамі Слонімшчыны і вялі бадзячы лад жыцця.

КРАЛІ Ў НЯБОЖЧЫКАЎ

Работнікі праваахоўных органаў затрымалі ў Мастах групу асобаў, якія займаліся крадзяжамі агароджаў на могілках.

Як высветлілася, гэта былі два мастаўчаніна і адзін жыхар вёскі Заполле Мастоўскага раёна. Вандалы прыязджалі на могілкі ў Дзярэчын, Галынку, Катчыно, Алексічы і ў іншыя вёскі Зэльвенскага і Мастоўскага раёнаў, адпілоўвалі надмагільныя агароджы з неіржавеючай сталі і адпраўлялі іх у Прыбалтыку. На след рабаўнікоў трапіў адзін з участковых міліцыянераў. У вясковым доме злачынцаў аказаўся цэлы склад нержавеючых трубаў, з якіх робіцца агароджы. Вандалы ва ўсім прызналіся. Вядзецца праверка.

Па звестках работнікаў крымінальнага вышуку Слонімскага РАУС, гэтыя злодзеі маюць дачыненне да крадзяжоў агароджаў на могілках у вёсцы Байкі.

БАБУЛЯ ВЫКЛІКАЛА МІЛІЦЫЮ

Пакуль гаспадыня дома на вуліцы Пушкіна займалася па гаспадарцы на падворку, у хату пранiклі двое аматараў пажывіцца за чужы кошт.

Злодзеі забралі спіртныя напоі і прадукты харчавання. А калі выходзілі з хаты, іх заўважыла гаспадыня. Няпрошаныя госці не захацелі ўступаць з бабуляй у гутарку і кінуліся наўцёкі. Гаспадыня спачатку пабегла за імі, але хутка апамятавалася і выклікала міліцыю.

Па гарачых слядах міліцыянеры затрымалі рабаўнікоў. Імі аказаліся мясцовыя жыхары. Адзін з іх раней ужо быў судзімы.

ТЭЛЕВІЗІЙНЫХ ЗЛОДЗЕЯЎ ЗАТРЫМАЛІ

У выніку пошукавых мерапрыемстваў работнікаў крымінальнага вышуку былі ўстаноўлены асобы, якія ўкралі тэлевізар з кватэры жанчыны на вуліцы Кірава.

Імі аказаліся двое раней судзімых маладых людзей. Узбуджана крымінальная справа.

Мікола КАНАНОВІЧ

ВЯСКОВЫЯ ПАКУТЫ

ЗАЧАРАВАНАЕ КОЛА НЕПЛАЦЯЖОЎ

(Працяг. Пачатак на 1 стар.)

У панядзелак раніцай на калгасным мехдвары старшыню мы не засталі — знаходзіўся ў ад'ездзе па справах. Галоўны заатэхнік і намеснік кіраўніка гаспадаркі Анатоль Жых патлумачыў, што калгас не можа выплаціць людзям заробак, бо Слонімскі завод сухога і абястлушчанага малака не пералічвае на калгасны рахунак грошы за здадзеную прадукцыю. Галоўны бухгалтар "Перамогі" Ірына Шундрык паведаміла, што малаказавод запазычыўся калгасу парадка 60 мільёнаў рублёў. І прыкладна такую ж суму доўгу гаспадарка мае па заробку і страхавых адлічэннях у фонд сацыяльнай абароны насельніцтва. Па словах Ірыны Аляксандраўны, у мінулым годзе малаказавод аплачваў калгасу ў лік доўгу за скарыстаную электраэнергію. У 2003 год слонімскія перапрацоўшчыкі малака ўступілі банкрутамі, і цяпер прадпрыемства не мае ніякай магчымасці разлічыцца з пастаўшчыкамі. Тым не менш, калгас "Перамога", як і іншыя гаспадаркі раёна, працягвае здаваць дзяржаве малако, фактычна, у крэдыт. Кіраўніцтва гаспадаркі шукае тыя рынкі збыту сваёй прадукцыі, дзе за яе адразу заплоцяць грошы. У калгасе ёсць свая свінаферма. Раней свініну здавалі на Мінскі хладакамбінат, і гэта, па словах Ірыны Шундрык, была надзейная крыніца даходаў. Аднак на сённяшні дзень камбінат калгасную свініну прымаць адмовіўся — халадзільнікі запоўнены. Свіней можна здаць на Слонімскі мясакамбінат, але там адразу паперэджваюць, што грошы заплацяць не раней, як праз месяц — паўтара. Атрымліваецца такое своеасаблівае зачараванае кола неплацяжоў, калі ўсе вінны ўсім, а грошай няма.



На мехдвары калгаса "Перамога"

Фота Віталя ГІЛЯ

Калгасным працаўнікам застаецца толькі спадзявацца, што іх кіраўніцтва знойдзе іншыя (замест традыцыйных мясакамбінат, малаказавод) рынкі збыту, бо прадаваць у гаспадарцы пакуль ёсць што, і людзі атрымаюць заробленыя грошы. На пытанне, як жа вяскоўцам быць з плацяжамі за той жа газ, галоўны бухгалтар "Перамогі" сказала, што і сама завінавацілася за газ. Людзям застаецца толькі спадзявацца, што і ў гэтым пытанні старшыня калгаса дамовіцца з кіраўніцтвам гаргаза, каб блакітнае паліва не адключалі, пакуль людзі не атрымаюць заробак. Пакуль жа наяўныя грошы ў гаспадарцы з'яўляюцца толькі ад рознічнага гандлю на гарадскім рынку. З той сумы якраз калгаснікам і заплацілі па 20 тысяч авансу і, па словах галоўнага бухгалтара, прыкладна, па столькі маркуецца выплаціць яшчэ ў бліжэйшы час.

Пад пасяўную кампанію "Перамога" атрымала мэтавы крэдыт на паліва. А летам гаспадарку чакае рэарганізацыя. Як дакладна стане называцца сённяшні калгас "Перамога", пакуль ніхто не ведае. Аднак перарэгістрацыя, на якую, дарэчы, таксама патрэбны грошы, аптымізму вяскоўцам не дадае. Ім пакуль зразумела толькі адно — ад замены шыльды грошы на банкаўскім рахунку не з'явяцца.

Мікола КАНАНОВІЧ

КАК НАС ОБСЛУЖИВАЮТ

КОМУ ПРАЗДНИК, А КОМУ — БЕДА

Во второй половине дня в пятницу, 21 марта, когда работники бытового обслуживания и жилищно-коммунального хозяйства начали праздновать свой профессиональный праздник, жильцы дома №11 по проспекту Независимости, в буквальном смысле слова, парились в своих квартирах.

Дело в том, что с самого утра в квартирах этого дома как из холодного, так и из горячего крана лился кипяток. "И если иногда бывает так, что из крана с горячей водой льется чуть теплая вода, то в пятницу из двух кранов хлещет кипяток, — жаловалась позвонившая в редакцию женщина. — И как нам детей купать, есть готовить? А в аварийной службе предприятия отопительных котельных (ПОК) нам сказали, что неисправность устранят только в понедельник, через три дня. И никто нам не может помочь. У них, видите ли, профессиональный праздник".

И вправду, в тот день, в пятницу, никто так и не смог отремонтировать подачу воды в 11-м доме по прспекту Независимости. В аварийной ПОК корреспонденту "ГС" объяснили, что на данный момент никто не может помочь этим людям, так как "все находятся на праздничном собрании". "Неужели все? И никто не может помочь?" — поинтересовалась я. "Такими неисправностями занимается наш мастер Василий Житкевич, а он сейчас — на торжественном мероприятии в СШ №2", — сказала мне дежурная аварийки.

Пришлось звонить в аварийную водоканала. Там пояснили, что их предприятие не отвечает за такого рода поломки. Однако, очень любезно объяснили, из-за чего могла произойти эта авария. "Скорее всего, у одного из жильцов дома сломался кран-смеситель. По этой причине, по всему стояку из двух кранов идет кипяток. Обратитесь в аварийную ПОК", — посоветовал мне дежурный.

Вновь набираю номер телефона аварийной ПОК, где мне пояснили, что в пятницу никто не отремонтирует подачу воды. Это сделают только в понедельник. "Единственное, чем можно помочь, так это перекрыть воду по всему стояку, чтобы кипяток не шел, — сказала дежурная. — Я вам еще раз говорю, что только мастер Житкевич может помочь, но... его сейчас нет".

Это звучало, как какое-то заклинание: "Только мастер Житкевич поможет..."

Однако "волшебник" Василий Житкевич, которого так ждали жильцы 11-го дома в пятницу, праздновал своей профессиональный праздник. И не мог он ничем помочь людям, надеявшимся на чудо. "Эта заявка поступила мне в 14.00, а в 15.00 было торжественное собрание, на котором мне нужно было присутствовать, — рассказал позже Василий Павлович. — Для того, чтобы отремонтировать краны по всему стояку, нужно было перекрыть воду на всей трассе. А этим занимается мастер Маркушевский. Однако вместо него в тот день был мастер Кречик... А он не перекрыл краны на трассе. Я несу ответственность за своих людей, поэтому не смог отправить их под кипяток. Они же могли травмироваться. Поэтому все ремонтные работы перенесли на понедельник".

Три дня жители 11-го дома ждали понедельника, чтобы, наконец-то, их заявку приняли к сведению и устранили неполадки. Уж очень неудобно, как мне кажется, остуживать кипяток для того, чтобы приготовить пищу, выкупать детей, постирать и т.д. В понедельник, по словам Василия Житкевича, вода была перекрыта и начались ремонтные работы.

Профессионализм, однако...

Ольга ШИНКЕВИЧ

ЗДАРЭННІ

НЕВЯДОМЫЯ "ПАГАСЦІЛІ" У СЯНЬКОЎШЧЫНЕ

20 сакавіка ў хату перасяленцаў з чарнобыльскай зоны ў Сянькоўшчыне залезлі цыганы. Злодзеі забралі мясныя прадукты, пасцельную бялізну і невялікую суму грошай.

Рабаўнікі прыехалі ў вёску на машыне, і іх бачылі мясцовыя жыхары. Аднак людзі не запомнілі нават нумар аўтамабіля. Работнікі міліцыі заклікаюць вяскоўцаў быць больш пільнымі пра сустрэчы з незнаёмымі асобамі.

БОЕПРЫПАСЫ ТРАПІЛІ Ў МІЛІЦЫЮ

21 сакавіка ў кватэры слонімца К. на Касаўскім тракце работнікі міліцыі выявілі ручную гранату. Цяпер эксперты вызначаюць, баявая яна ці вучэбная.

Падчас навядзення парадку ў хаце гаспадар прыватнага дома выпадкова знайшоў магазін з патронамі да пісталета "ТТ". Мужчына сваю знаходку здаў у міліцыю.

Мікола КАНАНОВІЧ

ПЕШАХОД АПЫНУЎСЯ ПАД КОЛАМІ

У адзін з мінулых выхадных дзён на Чырвонаармейскай вуліцы ў Слоніме пад колы легкавога аўтамабіля трапіў пешаход.

Як аказалася, чалавек быў у нецвярозым стане. З траўмаю пацярпеўшага даставілі ў раённую бальніцу.

Сяргей ЧЫГРЫН

АКЦЫЯ

ДЗЕНЬ БЯСПЕКІ ДАРОЖНАГА РУХУ

28 сакавіка ДАІ Слонімскага РАУС праводзіць адзіны дзень бяспекі дарожнага руху.

Яго мэтай з'яўляецца папярэджанне дарожна-транспартных здарэнняў, a дэвізам: п'яны вадзіцель — злачынец. У гэты дзень супрацоўнікі ДАІ выступяць у дзіцячых садах, школах, на прадпрыемствах і ў арганізацыях аб мерах па бяспецы дарожнага руху, а таксама будзе ўзмоцнены кантроль з боку супрацоўнікаў ДАІ на дарогах і вуліцах.

Сяргей ЧЫГРЫН


Наш Web-адрес: HTTP://GS.PROMEDIA.BY

НАВІНЫ

ЧИСТОЙ НАМ ВОДЫ И НИКАКОЙ БЕДЫ

Этими словами завершил свое выступление на торжественном собрании, посвященном Дню работников бытового обслуживания и коммунального хозяйства, директор ОАО «Слонимский водоканал» Василий Шкодов.

Пожелание хорошее и актуальное, поскольку нареканий в адрес водоканала у слонимчан предостаточно. А, как сказал на собрании председатель Слонимского райисполкома Мечислав Костюк, работа водоканала – на уровне политики. «Как хорошо вы работаете, такое настроение и у людей. Благополучия всем вам. Будет у нас хорошо, и жизнь будет намного прекраснее, чем она, к сожалению, пока есть».

Валерий КОВАЛЕНКО

УДЗЕЛЬНІК СЕМІНАРА

Слонімец Ігар Пракоф'еў прымаў удзел у семінары маладых літаратараў Беларусі, які адбыўся ў Мінскім Доме прэсы.

У семінары ўдзельнічалі больш сарака пачынаючых паэтаў, празаікаў, драматургаў і крытыкаў з розных куткоў нашай рэспублікі.

У ПЯЦЁРЦЫ ЛЕПШЫХ

Дызайнер нашай газеты Аляксей Гарайнаў заняў пятае месца ў конкурсе "Вёрстка-2002" і атрымаў дыплом і спецыяльны прыз.

Гэты конкурс праводзіўся сярод дызайнераў СНД часопісам "Publish" па праекту "PageMakerNotes". У ім прымалі ўдзел каля ста дызайнераў.

НА ЛЕПШУЮ ГУЛЬНЮ

Да 30 сакавіка працягнецца Слонімскі раённы агляд-конкурс на лепшую гульнявую праграму.

Гэтыя конкурсы праходзяць у сельскіх дамах культуры і клубах. Пераможцы атрымліваюць падарункі і прызы. З лепшаю гульнявою праграмай слонімскія культасветработнікі выступяць на падобным абласным конкурсе.

Сяргей ЧЫГРЫН

ЭКАНОМІКА

ШТО І ЯК ПАСЕЕМ?

■ Сяргей ЧЫГРЫН

На адным з апошніх пасяджэнняў прэзідыума Савета міністраў Беларусі абмяркоўваліся пытанні падрыхтоўкі да веснавых палявых работ.

На пасяджэнні было даручана ўсім аблвыканкамам, райвыканкамам, Міністэрству сельскай гаспадаркі і харчавання рэспублікі завяршыць падрыхтоўку тэхнікі, якая будзе выкарыстоўвацца ў веснавых палявых работах, а таксама забяспечыць закупку ў неабходных аб'ёмах нафтапрадуктаў, азотных угнаенняў, насення і г.д. Адначасова ўжо загадзя спланавана, што сёлета ў Беларусі павінна быць намалочана 6,4 млн. тон збожжа, выкапана 8,4 млн. тон бульбы, нарыхтавана 3 млн. цукровых буракоў і 60 тысяч тон ільновалакна.

Планы на будучы ўраджай, сапраўды, вялікія. Але падрыхтоўка да веснавых палявых работ ідзе з цяжкасцю. Найперш гэта звязана з рэарганізацыяй і рэфармаваннем калгасаў і саўгасаў у новыя ўнітарныя сельскагаспадарчыя прадпрыемствы. Цяжка адказаць сёння, што з гэтага атрымаецца, але, мабыць, і яно не выратуе нашу сельскую гаспадарку. На пасяўную плануецца выдаткаваць у выглядзе пазыкі сельгаспрадпрыемствам 60 тысяч тон дызельнага паліва і 15 тысяч тон бензіну.

Але калі вёска разлічыцца з тымі, хто дасць пазыку? А ці не лепш у краіне замест вялікіх унітарных сельгаспрадпрыемстваў (а гэта тыя ж самыя калгасы, толькі назва змянілася) стварыць належныя ўмовы для развіцця фермерства. Той жа малады Генрых Засімовіч з вёскі Сялявічы Слонімскага раёна арэндуе сёння чатыры гектары зямлі. А плануе ўзяць у арэнду гектараў дваццаць зямлі, на якой хоча вырошчваць бульбу, цукровыя буракі, збожжа. Але яму сёння не даюць крэдыту. І вось думае вясковец, за што купіць угнаенне, прыдбаць на першы час сякую-такую тэхніку. Але самае галоўнае, што жаданне ёсць у чалавека працаваць на зямлі. Дык стварыце яму і іншым умовы для гэтага. Тады не трэба будзе ў бяздонную калгасную бочку выкідваць мільёны рублёў. А тым больш думаць: як пасеюць нашыя калгасы? І ці пасеюць яны, наогул?


Фота Віталя ГІЛЯ

Зямля чакае насення

Напрыклад, на 14 сакавіка ў Слонімскім раёне было падрыхтавана 86 % насення льну, 45,3 % насення шматгадовых траў, а на Дзятлаўшчыне – і таго менш. А гэта далёка не стопрацэнтная падрыхтаванасць.

Што датычыць калгаснай тэхнікі, дык вынікі падрыхтаванасці яе да веснавых палявых работ падвёў Камітэт дзяржкантролю па Гродзенскай вобласці. У прыватнасці, як піша "Гродзенская праўда", у калгасе "Міжэвічы" Слонімскага раёна падчас праверкі рамонтныя майстэрні знаходзіліся ў аварыйным стане, электраэнергія была адключана, дах цёк, у памяшканні было холадна. У гаспадарцы не вырашана пытанне наконт механізатарскіх кадраў. Не хапае сямі трактарыстаў, чатырох вадзіцеляў, токара і зваршчыка. У калгасе выявіўся недахоп дызельнага паліва ў колькасці 3178 літраў на суму 1,6 мільёна рублёў. Дарэчы, у "Міжэвічах" не хапае 26 тон насення бульбы, забяспечанасць мінеральнымі ўгнаеннямі складае толькі 20 % да патрэбнасці, а фосфарнага ўгнаення няма наогул.

Няпростая сітуацыя склалася і ў сельгаспрадпрыемстве "Навадзевяткавічы". Калі гаспадарку правяралі супрацоўнікі дзяржкантролю, тут мелася толькі 300 літраў дызпаліва і 1900 літраў бензіну, што складала 1,1 % да патрэбнасці. А вось масел зусім не было.

У гэтай гаспадарцы пад вясновы сеў не хапае 125 тон насення бульбы...

Шмат праблем з пачаткам веснавых палявых работ у калгасе імя Заслонава Дзятлаўскага раёна, у гаспадарках Зэльвенскага і Мастоўскага раёнаў, якія суседнічаюць са Слонімскім раёнам. Гледзячы на ўсё гэта і ўзнікае пытанне: ці пасеем сёлета? А калі і пасеем – дык як? ■

НАВІНЫ

ЛЕПШЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ ПРА ГЕРМАНІЮ НАШЫХ АЎТАРАЎ

У Мінскім Міжнародным адукацыйным цэнтры адбылася ўрачыстая цырымонія ўзнагароджвання лаўрэатаў журналісцкага конкурсу "Лепшыя матэрыялы пра Германію і краіны Еўрапейскага Саюза".

Пераможцамі конкурсу сталі нашы чытачы і аўтары са Слоніма Ірына Валынчык і Ігар Падгарадзецкі, якія ў мінулым годзе друкавалі на старонках "Газеты Слонімскай" свае матэрыялы пра падарожжы па еўрапейскіх краінах.

У КАСТРОВІЧАХ ПАГУКАЮЦЬ ВЯСНУ

У нядзелю, 30 сакавіка, у вёсцы Кастровічы Слонімскага раёна адбудзецца свята "Гуканне вясны".

Усе, хто прыме ўдзел у свяце, убачаць спальванне пудзіла, дзіцячыя карагоды, пачуюць вясновыя песні, а таксама канцэрт мастацкай самадзейнасці. Свята пачнецца а 11 гадзіне каля Кастровіцкага дома культуры.

"СЛАВЯНАЧКА" СТАЛА НАРОДНАЙ

Вакальная група "Славяначка" з Кастровіцкага сельскага дома культуры атрымала афіцыйны дакумент з Міністэрства культуры Беларусі аб тым, што ёй прысвоена званне "народная".

"Славяначка" – гэта восем дзяўчат і два хлопцы, якія спяваюць беларускія, украінскія і рускія народныя песні. У бліжэйшы час вакальная група з песнямі выступіць на абласным аглядзе мастацкай самадзейнасці ў Гродне.

Сяргей ЧЫГРЫН

ДОЛГ – 104,5 МЛН. ДОЛЛАРОВ

Задолженность по заработной плате в Беларуси составляет в настоящее время 20,8 млрд. белорусских рублей (104 млн. 480 тыс. долл.).

ХАРТИЯ-97

ЭКАНОМІКА

МІНІСТР ВЫРАШЫЎ НЕ ДАВАЦЬ МАКУЛАТУРУ КПЗ

■ Мікола КАНАНОВІЧ

Працоўны калектыў Слонімскага кардонна-папяровага завода з 10 па 17 сакавіка знаходзіўся ў вымушаным адміністрацыйным адпачынку.

На КПЗ працуюць парадка 1500 чалавек. За кошт падаткаў прадпрыемства фарміруецца, прыкладна, 20% мясцовага бюджэту. Так што вымушаны прастой дорага абыходзіцца не толькі работнікам КПЗ.

Як патлумачыў генеральны дырэктар завода Пётр Саліта, рашэнне прыпыніць працу было прынята ў сувязі са складанасцямі з пастаўкамі сыравіны. У сярэднім, у суткі на прадпрыемстве расходуецца 125 тон макулатуры. Цяпер яна паступае ў абмежаваных колькасцях і яе не хапае для нармальнай працы завода.

Да нядаўняга часу пастаўка сыравіны на Слонімскі КПЗ ажыццяўлялася цэнтралізавана з усёй Беларусі па раней усталяваных тарыфах. І хоць, па словах дырэктара КПЗ, у краіне заўсёды адчуваўся пэўны недахоп сыравіны для папяровай вытворчасці, аднак такіх праблем, каб з-за адсутнасці макулатуры даводзілася прыпыняць працу, раней не было. Праблемы пачаліся, калі з Міністэрства лесапапяровай прамысловасці выйшаў загад, згодна якога нарыхтоўчым канторам забараняецца адпускаць сыравіну на раейшых умовах індывідуальным прадпрымальнікам і прадпрыемствам, што не ўваходзяць у галіновы канцэрн Беллеспапера прама. КПЗ з'яўляецца акцыянерным таварыствам і ў канцэрн беларускіх вытворцаў паперы пакуль не ўваходзіць, а значыць выступае канкурэнтам прадпрыемствам канцэрна. Таму ў Мінску вырашылі для канкурэнтаў падняць цэны на сыравіну на 50 працэнтаў.

Каб вызначыцца, як дзейнічаць у новых эканамічных рэаліях, праўленнем завода тэрмінова быў скліканы сход акцыянераў, на якім прынялі рашэнне ўступаць у канцэрн. Усе неабходныя для гэтага дакументы ўжо знаходзяцца ў Мінску. Генеральны дырэктар завода Пётр Саліта, які некалькі разоў наведваў сталіцу, каб фарсіраваць вырашэнне пытання з пастаўкамі сыравіны на прымальных умовах, сказаў, што ў канцэрн беларускіх вытворцаў паперы Слонімскі КПЗ прымуць, гэта толькі справа часу. А покуль заводу цалкам адмовілі пастаўляць макулатуру нарыхтоўчыя канторы Магілёўскай і Гомельскай абласцей. Той сыравіны, якая апошнім часам была прывезена і прывозіцца з іншых рэгіёнаў Беларусі, па словах дырэктара завода, хопіць да канца сакавіка.


На мінулым тыдні кіраўнік прадпрыемства выказаў меркаванне, што пытанне з пастаўкамі макулатуры ўсё ж павінна ў хуткім часе вырашыцца для завода станоўча. ■

КО ДНЮ ТЕАТРА


ВЛЮБЛЕННЫЕ В СЛОНИМ, ТЕАТР И АКТЕРОВ

Недавно Слонимский белорусский драматический театр получил подкрепление в составе двух режиссеров. И если имя Виктора Небальсина знакомо слонимчанам по таким постановкам, как спектакли «Комедия», "Крыштальная сняжынка", то творческие работы Дениса Нупрейчика еще только должны стать открытием для любителей театра.

И как нельзя кстати, накануне Международного дня театра, состоялась беседа корреспондента «ГС» с двумя режиссерами.



Виктор Небальсин



Денис Нупрейчик

Денис Нупрейчик: Я приехал в Слоним ставить свой дипломный спектакль, пьесу Николая Коляды «Персидская сирень». Это известный драматург. С актерским составом уже, практически, определился, можно приступать к постановке.

После премьеры из Академии искусств приедет комиссия, в составе которой будет и мой педагог, народный артист Беларуси Борис Иванович Луценко.

Они и выставят дипломную оценку на основании моей работы.

Корреспондент: Как вы считаете, направление для постановки дипломной работы в Слоним для вас это удача?

Д. Н.: Сейчас, в принципе, ставить дипломный спектакль сложно где бы то ни было. И хотя нас на режиссерском курсе в этом году выпускается всего пятеро, но в каждом театре Беларуси есть свой штатный режиссер.

К тому же, сейчас театрам катастрофически не хватает денег. Поэтому, при всем желании, сделать дипломный спектакль сложно. И я рад, что в Слониме мне, как молодому режиссеру, пошли навстречу.

Виктор Небальсин.: Директор театра – мудрый человек, – включается в разговор Виктор Небальсин. – Он любит театр и понимает нужды актера. Вот и Дениса на период постановки он взял в штат, нашел для этого деньги.

Корр.: Вас, Денис, устраивает предложенная театром зарплата?

Д. Н.: Пока зарплату еще не получал. Но я думаю, если бы люди узнали размер зарплаты режиссера, актера, то удивились бы: Боже мой, как за эти деньги актеры еще живут и при этом что-то делают на сцене?

Корр.: Вы сами минчанин. Какое впечатление произвел на вас наш провинциальный Слоним?

Д. Н.: Если говорить о городе, то Слоним – замечательный, уютный, тихий городок, без лишней суеты...

В. Н.: А в наших актеров Денис просто влюбился! Мы же с ним тут ночи напролет разговариваем. И я, зная слонимский театр, рекомендовал Денису актеров для его спектакля.

А после просмотра нескольких репетиций Денис просто удивился, насколько точное попадание в роли, насколько сильное у актеров желание работать, самоотверженность.

Д. Н.: Да, актерами я очарован. И, думаю, что в начале мая можно ждать премьеру. Порадуем слонимчан, любителей театра, надеюсь, неплохим спектаклем.

Корр.: А чем Виктор Васильевич порадует нас в этом году?

В. Н.: Прежде всего, хочу сказать, что в Слоним я приехал с огромным удовольствием. И сначала буду ставить спектакль «Пакрыўджаныя».

А пишущую машинку видишь? Так вот, я сейчас заканчиваю новогоднюю – аж новогоднюю! – сказку...

Корр.: То есть, сотрудничество планируется долговременное?

В. Н.: Я приехал в Слоним навсегда. Если раньше меня приглашали на разовые постановки и в газетах критически писали "Не лезь в чужой монастырь со своим уставом", то теперь я с полным правом считаю этот "монастырь" (театр) своим. Ведь, в общей сложности, в Слониме я проработал пять лет.

Корр.: И что изменилось в театре со времени вашего последнего приезда?

В. Н.: Я застал людей, актеров с жадными глазами, – жадными до работы. Они все на меня, как дети, смотрят с большой надеждой. Потому что знают, что я обязательно начну закручивать интересную работу...

Корр.: Значит, предыдущие режиссеры заставили их по этой работе соскучиться, затосковать?

В. Н.: По творческой работе, – видимо, да. Брались пьесы, сами по себе интересные, но репетировались они таким способом, что актеры и режиссер не смогли стать друзьями, возникало взаимное недовольство.

Корр.: Вам же, насколько я помню, прощалось многое, в том числе и излишне бурные эмоции вплоть до полетов стульев на сцену во время репетиции...

В. Н.: Только не стулья это были, а стол. Причем, ситуация была такая: я звал актера "Скорей, скорей!" на сцену. И точность, своевременность его выхода имела огромную важность. Актер же сбравировал, сыграл "на себя" – мол, я тут пуп земли – и тем самым наплевал на партнеров, на театр вообще. Если бы это было только в мою сторону направлено, я бы просто послал его подальше...

Но ... репетиция – это творческий процесс, где все – в превосходной степени. Так что, бравада актера подействовала на меня, все равно что в одуванчик окурком ткнуть.

Я взял стол, как грохнул о сцену – и в щепки...

Хочу отметить, что Станиславский, между прочим, на сцене палки ломал... Иногда даже на спинах актеров.

Корр.: Кроме классического и сказочного репертуара, что-нибудь из произведений современных авторов вы на слонимской сцене видите?

В. Н.: С этим очень трудно. Потому что сейчас драматургии в Беларуси на родном языке, к сожалению, практически нет. У нас драматурги, почему-то, все пишут на русском языке, а потом делают перевод на белорусский.

Корр.: Отсюда следующий вопрос Денису. Вы пьесам на каком языке отдаете предпочтение?

Д. Н.: В данный момент язык пьесы для меня не является основополагающим. Главное – качество драматургии. Моя же дипломная работа – русскоязычная пьеса. Она об одиночестве человека, о том, что мучает нас испокон веку, и есть ли выход из этого одиночества.

Корр.: Виктор Васильевич, за последние годы в театре сменилось несколько директоров. Что вы можете сказать о нынешнем?

В. Н.: Слонимские актеры полжизни проводят в автобусах, на гастролях. И новый директор театра, Николай Васильевич Лишик, изо всех сил бьется, чтобы лишнюю копейку для них найти.

Усилиями директора слонимскому театру в нынешнем году в Академии искусств выделено три учебных места. Две девушки и один парень будут работать артистами вспомогательного состава и одновременно учиться.

Нам же остается только творчество, без оглядки на хозяйственные дела.

Корр.: В таком случае, успехов вам и полных залов на ваших спектаклях.

Валерий КОВАЛЕНКО, фото Виталия ГИЛЯ

МАСТАЦТВА

І КАРЦІНЫ БЫВАЮЦЬ ЖЫВЫМІ



Зачараваныя прыгажосцю

У слонімскім краязнаўчым музеі распачала дзейнічаць выстава галаграфіі, прадстаўленая Санкт-Пецярбургскім Дзяржаўным інстытутам імя С. Вавілава.

Выстава галаграфічных карцін прадстаўлена 25 экспанатамі, 2 з якіх – партрэты, астатнія – сучасныя мастацкія кампазіцыі на розную тэматыку. Найбольш цікавымі працамі, на мой погляд, з'яўляюцца карціны "Хрыстос", "Чэрап і змяя", "Анаконда" і інш.

Галаграфія – гэта метад атрымання аб'ёмнага адлюстравання прадметаў, заснаваны на інтэрферэнцыі хваляў. Ідэя галаграфіі ўпершыню была выказана англійскім вучоным Габорам яшчэ ў 50-я г.г. XX стагоддзя, але тэхнічнага ажыццяўлення не атрымала.

Толькі з узнікненнем лазераў адкрылася магчымасць практычнага ўжывання галаграфіі ў оптыцы.

Як мастацтва, галаграфія ўзнікае ў 70-я гады, калі савецкім вучоным Ю. Дзенісюком было прапанавана запісаць галаграму на тоўстай эмульсіі. У гэтым выпадку карціна атрымалася трохмернай і таму набыла новыя якасці.

Юлія РЫЖЫКАВА

НАВІНА

ПРЫЙШЛО СВЯТА КНІГІ



Кніга — лепшы сябар для дзяцей

Тыдзень дзіцячай і юнацкай кнігі "Гэты цуд завецца кніга" адчыніўся ў пятніцу, 21 сакавіка, у Раённым доме культуры.

Загадчыца гарадской дзіцячай бібліятэкі Людміла Мазюк і маленькія чытачы Насця Гукайла, Ала Сівец пачалі святочны вечар.

Амаль поўная зала юных чытачоў з розных школ горада з захапленнем слухала выступленне нашага земляка, знакамітага пісьменніка, рэдактара часопісаў "Бярозка" і "Лесавік" Уладзіміра Ягоўдзіка. Ён расказаў дзецям пра свае кнігі, цікавыя выпадкі са свайго жыцця. Пасля гэтага адбылося ўзнагароджванне ўдзельнікаў конкурсу "Падарожжа ў дзівосны свет прыроды па кнігах У. Ягоўдзіка", якое было арганізавана гарадской дзіцячай бібліятэкай. Вучні 3-х, 4-х і 5-х класаў СШ №1, СШ №5, гімназіі №1 і Слонімскага дзіцячага дома чыталі кнігі У. Ягоўдзіка, пісалі водгукі і малявалі малюнкі. Адзінаццаць аўтараў найбольш цікавых водгукаў і малюнкаў атрымалі ў падарунак кнігі нашага земляка з яго аўтографам.

На адкрыцці свята кнігі адбылося тэатралізаванае прадстаўленне па матывах дзіцячых кніг і часопісаў з удзелам казачных герояў – Чырвонай Шапачкі, Папялушкі, Доктара Айбаліта, Бураціна, Васі Васёлкіна, Лесавіка і інш. Пасля гэтага ўсе прысутныя глядзелі канцэрт мастацкай самадзейнасці СШ №8, на якім выступілі Лера Міско, Максім Харытановіч, Дар'я Чарданцава, Паліна Закудоўская, Вікторыя Бараноўская, Сяргей Сарока, Аліса Лапінок, Вольга і Юлія Крот, Дзіяна Лугіна, Кірыл Відусаў і інш.

Вольга ШЫНКЕВІЧ

ВОЛКОВЫСК

БЮДЖЕТ НЕДОПОЛУЧАЕТ МИЛЛИОНЫ

По сообщению начальника налоговой инспекции по Волковыскому району Тамары Стасевич, районный бюджет недополучил налоговых поступлений, по сравнению с 2001 годом, в сопоставимых ценах на 1698,9 миллионов рублей.

Об этом было заявлено на недавнем совещании районного исполнительного комитета. По словам Тамары Стасевич, меньше поступило налога на прибыль, добавленную стоимость, единого налога для производителей сельхозпродукции, акцизов, платежей из выручки в республиканский бюджет. 38 предприятий по итогам финансово-хозяйственной деятельности оказались убыточными. Уже на начало нынешнего года кредиторская задолженность бюджетных организаций составила 825,2 млн. рублей.

ПОД КРЫЛО «БЕЛЛАКТА»

Слонимский, Дятловский, Новогрудский и Кореличский молочные заводы войдут в доверительное управление Волковыского ОАО «Беллакт».

Об этом было решено на недавнем совещание в Волковыске с участием председателя облисполкома В.Савченко.

Это значит, что вопросы перераспределения сырьевых молочных ресурсов, производство и реализация продукции будут теперь решаться на данных предприятиях под руководством «Беллакта». Такое решение, по мнению руководства области, должно помочь отстающим молочным заводам поправить экономическое и финансовое положения.

БОЙТЕСЬ ЛЮДЕЙ, ТОВАР ПРИНОСЯЩИХ

В Волковыский РОВД поступило сообщение от местной жительницы о том, что к ней в квартиру вошли три цыганки с предложением купить покрывало.

После их ухода хозяйка квартиры обнаружила, что из шкафа, где она хранила деньги, исчезли 100 тысяч рублей.

По данному факту возбуждено уголовное дело.

СИГНАЛ СВЕТОФОРА – ЗАКОН ДЛЯ ВСЕХ

Житель Волковыска, управляя автомобилем «Ауди-80», на большой скорости пытался проскочить перекрёсток на запрещающий сигнал светофора.

Пытаясь избежать столкновения с выехавшей на зелёный свет машиной, совершил манёвр, в результате чего машина стала неуправляемой и выехала на тротуар, где ударилась в стойку светофора. В результате был травмирован восьмилетний мальчик, который в бессознательном состоянии был доставлен в реанимационное отделение больницы.

По данному факту ведётся следствие.

Александр ДАНИЛИН

СВЯТА

ЮБІЛЕЙ НАШАЙ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ

85 гадоў назад была абвешчана Беларуская Народная Рэспубліка. 25 сакавіка 1918 года Трэцяй Устаўной граматай Рады Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР) Беларусь была абвешчана вольнай і незалежнай дзяржавай.

Акт 25 сакавіка быў рашучым пратэстам супраць падзелу Беларусі кайзераўцамі і бальшавікамі. Увесь этнічны беларускі абшар упершыню абвяшчаўся адзінаю дэмакратычнаю дзяржавай. У гэты час быў створаны і пачаў працаваць першы беларускі ўрад, які называўся Народным Сакратарыятам. Народны Сакратарыят зацвердзіў дзяржаўную пячатку з гербам "Пагоня". Ішла падрыхтоўка да адкрыцця ў Мінску Беларускага універсітэта, адкрыліся курсы па беларусазнаўству для беларусаў і людзей іншых нацыянальнасцяў, наладжваліся эканамічныя і гандлёвыя сувязі з дзяржавамі.


Незалежную Беларускую Народную Рэспубліку дэ-факта прызналі Арменія, Аўстрыя, Грузія, Латвія, Літва, Польшча, Турцыя, Украіна, Фінляндыя, Чэхаславакія, Эстонія.

Расійскія палітыкі і бальшавікі былі супраць існавання нашай незалежнай дзяржавы. Яны хацелі, каб Беларусь заставалася часткай Расіі.

Але воля нашага народа да самастойнасці мацнела і ніхто не мог сказаць, што беларускага народа няма.

Дзень 25 сакавіка — гэта Дзень Волі, найвялікшае свята нашай незалежнасці і нашай гісторыі.

Сяргей ЧЫГРЫН



Паштоўка з дзяржаўным гербам і гербамі беларускіх ваяводстваў



Першы ўрад Беларускай Народнай Рэспублікі

ГРОДНА

ЖУРНАЛІСТЫ "ПАГОНІ" ВЯРНУЛІСЯ ДАХАТЫ

Павел Мажэйка, асуджаны журналіст газеты "Пагоня", вярнуўся дахаты. Суд Жлобінскага раёна 21 сакавіка прымяніў у дачыненні да яго ўмоўна-датэрміновае вызваленне.

У папраўчай установе адкрытага тыпу №1 пры Жлобінскім РАУС Павел правёў 6 месяцаў і 21 дзень. Пасля сябе на "хіміі" асуджаны журналіст пакінуў бібліятэку, створаную пры дапамозе калегаў з Беларускай асацыяцыі журналістаў, газеты "Народная воля", сяброў партыі БНФ.

— Падчас майго знаходжання там узнікла традыцыя, паводле якой кожны асуджаны пры выхадзе на волю будзе пакідаць на жлобінскай "хіміі" кнігу, — распавядае Павел Мажэйка.

Для кнігазбора, які ўжо налічвае калі тысячы выданняў, кіраўніцтва "хіміі" выдзеліла асобны пакой. Зараз там усталёўваюцца стэлажы, ствараецца каталог, а ў бліжэйшы час будзе прызначаны бібліятэкар.

Са Жлобіна Павел прывез стос з амаль дзвюх тысяч паштовак і лістоў са словамі падтрымкі, якія прыходзілі яму з розных куткоў свету. Журналіст шкадуе толькі, што не здолеў адказаць усім.

Некалькімі тыднямі раней дахаты вярнуўся Мікола Маркевіч, які разам з Паўлам быў асуджаны за паклёп на прэзідэнта. Рэдактару зачыненай газеты "Пагоня" замянілі неадбытую частку пакарання на больш мяккую — папраўчыя працы па месцу жыхарства.

Мікола ўжо ўладкаваўся экспедытарам у фірму "Верасень". Паводле закону, штомесяц 15 адсоткаў свайго заробку ён будзе пералічваць у дзяржаўны бюджэт.

— Мы яшчэ не на свабодзе, нам проста замянілі меру пакарання, — гаворыць Мікола Маркевіч.

Юлія ДАРАШКЕВІЧ

«БИРЖЕ ИНФОРМАЦИИ» ВЫСТАВІЛІ "ПЯЦЁРКУ"

Гродзенская газета «Биржа информации» адсвяткавала сваё пяцігоддзе.

На свой першы юбілей, які святкаваўся ў гарадскім доме афіцэраў, рэдакцыя запрасіла ўсіх жадаючых. Павіншаваць газету прыехалі прадстаўнікі Беларускай асацыяцыі журналістаў, Фонду развіцця рэгіянальнай прэсы з Мінска, рэдактары "Інформ-прогулки" з Лунінца, "Местной газеты" з Ваўкавыска, а таксама гродзенскія калегі і чытачы.

— Пяць — гэта не толькі колькасць гадоў "Биржи", — зазначыў у сваім віншаванні Мікола Маркевіч, рэдактар зачыненай газеты "Пагоня". — Пяць — гэта адзнака, гэта "пяцёрка".

Пасля закрыцця ў 2001 годзе "Пагоні", "Биржа информации" засталася адзінай незалежнай газетай у Гродне.

Яна выходзіць раз на тыдзень на рускай і беларускай мовах накладам каля дзесяці з паловай тысяч паасобнікаў.

Юлія ДАРАШКЕВІЧ

АДСВЯТКАВАЛІ ДЗЕНЬ ВОЛІ

Каля ста чалавек у Гродне прынялі ўдзел у святкаванні 85-й гадавіны абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі.

23 сакавіка гродзенцы сабраліся ля будынка, у якім у 1918-19 гадах месціліся камендатура і ўрад БНР. Удзельнікі свята ўсклалі кветкі да памятнай шыльды, якую напярэдадні свята ўсталявалі невядомыя патрыёты.

Затым з бел-чырвона-белымі сцяжкамі ў руках народ праз горад рушыў у майстэрню мастака Зміцера Іваноўскага, дзе адбыўся святочны канцэрт. Усё мерапрыемства здымалася і суправаджалася дзесяткам міліцэйскіх машынаў.

Па заканчэнні імпрэзы трое ўдзельнікаў святочнага шэсця былі затрыманыя і дастаўленыя ў Ленінскі РАУС. Там у іх адабралі бел-чырвона-белыя сцяжкі. Пасля таго, як затрыманыя напісалі тлумачальныя запіскі, іх адпусцілі.

Юлія ДАРАШКЕВІЧ

ДЗЯТЛАВА

ГОСЦЬ З ГАМБУРГА

Дзятлаўскі цэнтр карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі наведаў нямецкі спонсар Хорст Мёнке, які ўзяў пад сваю апеку не толькі гэтую ўстанову, але і мясцовую школу-інтэрнат.

Ён і раней наведваў горад і прывозіў падарункі, а падчас гэтай сустрэчы перадаў цэнтру чэк на тысячу еўра, а таксама адзенне для дзяцей, акуляры і мяккія цацкі.

КОНКУРС ПЛАКАТАЎ

Дзятлаўская станцыя турызму і краязнаўства правяла конкурс плакатаў пад назвай "Свет у XXI стагоддзі".

Адлюстроўваліся тэмы "Мы супраць вайны", "Я і Радзіма", "Экалогія — лёс краіны".

Лепшымі прызнаны работы юных мастакоў Ільі Семяніка з Лявонавіцкай СШ, Наталлі Барадзюк з Раготна, Сяргея Каско з Гезгалаў і іншых.

АБАРОНЦЫ СТАЛІНГРАДА

У Дзятлаве жывуць дзве жанчыны, якія ў гады Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічалі ў абароне Сталінграда.

Гэта Марыя Мікалаеўна Пуйта і Марыя Васільеўна Ільюшэнка. З нагоды 60-годдзя Сталінградскай бітвы абедзьве яны атрымалі памятныя знакі, якія сведчаць аб іх воінскай доблесці.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

ЗЭЛЬВА

ПАЭТЫЧНА-МУЗЫЧНАЯ СУСТРЭЧА

Адбылася сустрэча настаўнікаў і вучняў Зэльвенскай сярэдняй школы № 2 з пісьменнікамі-землякамі і іх сябрамі — Уладзімірам Мазго, Аленай Таболіч, Уладзімірам Маруком і кампазітарам Алегам Елісеенкам.

Вучні падрыхтавалі змястоўны і цікавы літмантаж, а паэты прачыталі свае новыя вершы.

Пётр МАРЦІНОЎСКІ

МАСТЫ

СТРАЛЯЮЦЬ САБАКАЎ

У Мастах распачаўся адстрэл сабакаў. Гэта акцыя праводзіцца днём, і, як заўжды, збіраюцца староннікі і праціўнікі гэтага мерапрыемства.

Напрыклад, на вуліцы Чкалава, што знаходзіцца на Завакзаллі, трупы застрэленых сабак засталіся ляжаць прама на праезжай частцы.

Антон МАКЕЙ

ЗГАРЭЛА САУНА

У сауне, што знаходзіцца ў будынку інтэрната Мастоўскай райаграпрамтэхнікі, здарыўся пажар.

Па якой прычыне агонь знішчыў сауну, устанаўліваюць спецыялісты.

Антон МАКЕЙ

ЗЕЛЬВА

«БОЛЬШЕВИК» РАБОТАЕТ ПО-БОЛЬШЕВИТСКИ

Комитетом государственного контроля Гродненской области проведена проверка финансово-хозяйственной деятельности колхоза «Большевик» Зельвенского района.

В ходе проверки установлен ряд грубых нарушений. Колхоз в прошлом году недовыполнил план по поставке государству мяса на 9 тонн, а молока — на 242 тонны. Недополученная денежная выручка составила свыше 53 миллионов рублей. Тем не менее, "Большевик" реализовал коммерческим структурам 230 голов скота по заниженным ценам. Убыток от этого составил около 96 миллионов рублей.

В колхозе с нарушением производятся начисление и выплата заработной платы, отсутствует должный контроль за фактическими объёмами выполненных работ, наряды на сдельную работу по ремонту техники не составляются.

В хозяйстве не налажен надлежащий контроль за работой машинно-тракторного парка и использованием горюче-смазочных материалов. Например, расход бензина на эксплуатацию служебного автомобиля «Нива», закреплённого за председателем колхоза, составил за прошлый год 8201 литр , или более 15 % от его наличия в хозяйстве. А на ремонт автомобиля председателя было затрачено более трёх миллионов рублей.

Имеют место нарушения в учёте животноводческой продукции. Необоснованно списывается молоко на выпойку телят. Не уделяется должное внимание воспроизводству дойного стада. В прошлом году на сто коров получено лишь 63 телёнка. Яловость стада повлекла убыток на сумму свыше 55 миллионов рублей.

В ходе проверки колхоза «Большевик» Зельвенского района вскрыты и другие факты бесхозяйственности. По её результатам к хозяйству применены экономические санкции, а четыре человека привлечены к административной ответственности. Председатель колхоза М. Горкуша освобождён от занимаемой должности.

Сергей ЧИГРИН



Надпись на плакате: "Животноводство — дело живое, творческое"

МАСТЫ

У ІХ СВАЯ ПРЭСА

Днямі адбылася арганізацыйная сесія Мастоўскага райсавета новага склікання.

Акрамя абраных дэпутатаў на ёй прысутнічалі дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Генадзь Дылеўскі, старшыня райвыканкама Аляксандр Кісялёў, прадстаўнікі з вобласці, старшыні сельсаветаў, кіраўнікі арганізацый горада і раёна.

Пасяджэнне адкрыў старшыня раённай выбарчай камісіі Аляксандр Гвоздзь. Пасля пераліку запрошаных, ён катэгарычна запатрабаваў, каб усе астатнія пакінулі залу. Нягледзячы на пратэсты карэспандэнта "ГС" і спасылкі на Канстытуцыю РБ ды законы, Аляксандр Мікалаевіч адказаў, што "у іх ёсць свая прэса, і аб ходзе пасяджэння ўсе жадаючыя даведаюцца адтуль". Пасля таго, як непажаданы журналіст і даверанная асоба аднаго з дэпутатаў пакінулі залу, сесія распачала працу. На пасаду старшыні райсавета быў вылучаны былы яго кіраўнік Георгій Каробка, які папярэдне меў гутарку з 30 іншымі абранымі дэпутатамі з мэтаю вывучэння сваіх прыхільнікаў. Аднак выбары не былі безальтэрнатыўнымі. На пасаду старшыні выказалі жаданне балатавацца Дзмітрый Мілашэўскі і самы малады дэпутат — 20-ці гадовы Аляксандр Зарэмбюк. У выніку таемнага галасавання перамогу атрымаў Георгій Каробка. Надалей, падчас гэтага пасяджэння былі створаны чатыры камісіі: эканамічная, сацыяльная, аграрная і аховы акаляючага асяроддзя, а таксама абраны іх склад і іх кіраўнікі.

На тым сесія закончыла сваю працу.

Язэп ПАЛУБЯТКА

ЗАТАПІЛА ПАДВАЛЫ

У Мастах у некалькіх шматпавярховых дамах па вуліцы Будаўнікоў з наступленнем цяпла былі затоплены падвалы.

Вады было настолькі шмат, што яе не паспявалі адпампоўваць камунальныя службы. За адну змену працы адбіралася каля 60 кубаметраў вады.

Антон МАКЕЙ

ГРОДНО

25 ЛУЧШИХ ПРЕДПРИНИМАТЕЛЕЙ

В Гродно вручены призы победителям областного конкурса на звание лучшего предпринимателя 2002 года.

Всего было награждено 25 предпринимателей и руководителей частных предприятий в 12 номинациях.

"Почетным предпринимателем Гродненской области" был назван руководитель унитарного частного фермерского хозяйства "Спадар" из Сморгонского района Виктор Володько. Он же победил и в номинации "Лучший предприниматель — организатор рабочих мест".

В этом году областным комитетом по предпринимательству отбирались лучшие предприниматели в сфере промышленного производства, строительства, транспортно-экспедиционных услуг, общественного питания, торговли, торговли на рынках, фермерства, экспорта, привлечения инвестиций. По словам заместителя председателя облисполкома Сергея Дайнеко, в этом году не оказалось ни одного победителя в номинации "Оказание социально значимых услуг", так как ни одна заявка не соответствовала определенным для этой номинации критериям. Также не нашла победителя и награда за второе место в номинации "Привлечение инвестиций".

По словам Сергея Дайнеко, на участие в областном конкурсе подавалось 70 заявок. В этом году появились также две специальные номинации.

Лучший руководителем субъекта инфраструктуры поддержки предпринимательства назван руководитель Центра поддержки предпринимательства ООО "Технология" из Слонима Сергей Козицкий.

Еще одна новая награда — "За лучшее освещение проблем предпринимательства" — досталась редактору гродненской областной студии телевидения Галине Карипиди.

Ирина ЧЕРНЯВКА

ОСЛОЖНИЛАСЬ РАБОТА ДИСПЕТЧЕРСКОЙ СЛУЖБЫ МЧС

Диспетчерская служба МЧС Гродненской области практически парализована из-за перегруженности телефонных линий ошибочными звонками.

С начала марта количество звонков по номеру "01" в службу МЧС Гродненской области увеличилось со 150 до двух тысяч в сутки. Почти все эти звонки — результат ошибок, которые совершают жители, пытаясь дозвониться в другие районы области.

Проблема возникла в связи с изменением правил набора номеров внутриобластной телефонной сети. Жители районов, которые хотят позвонить в Гродно, должны набирать код не 8-22, как прежде, а код Гродно — 8-0152. Однако в телевизионной рекламе, которая разъясняла новые правила набора, код областного центра указывался без предварительной восьмерки. Именно так его набирают многие жители области и ошибочно попадают в диспетчерскую службу центра пропаганды и обучения областного управления МЧС.

Нынешние две тысячи звонков ежесуточно — это примерно по сотне в час, на каждый из которых диспетчер тратит, как минимум, 20-30 секунд, отрываясь от своей основной работы. "Наши дежурные просто сходят с ума от этого шквала. У них есть много другой важной работы, но из-за этих звонков они не могут ею заниматься", — так прокомментировал ситуацию старший инспектор центра пропаганды и обучения Александр Суворов.

Пока, отметил он, перегруженность телефонных линий МЧС ошибочными звонками не привела к серьезным сбоям в работе пожарных и спасательных служб. Однако это может произойти в любую минуту.

Ирина ЧЕРНЯВКА

ГРОДНО

ОТКРОЕТСЯ БОЛЬНИЦА ДЛЯ БОМЖЕЙ И АЛКОГОЛИКОВ

В апреле в поселке Бояры Гродненской области, на месте бывшего стационара для душевнобольных, откроется новая противотуберкулезная больница на 80 мест.

Об этом сообщил главный врач государственного объединения здравоохранения "Фтизиатрия" Дмитрий Лучина на пресс-конференции в Гродно. По словам главврача, в новой противотуберкулезной больнице будут лечиться душевнобольные, зараженные туберкулезом, а также асоциальные лица — бомжи, алкоголики и так далее. В первую очередь, туда будут перемещены пациенты 40-местной противотуберкулезной больницы для асоциальных лиц, расположенной в поселке Бенякони Вороновского района, и 40-местного психотуботделения спецбольницы "Островля". В свою очередь, стационар в Бенякони будет закрыт из-за аварийного состояния здания, построенного в 1862 году.

В целом же, как утверждает Дмитрий Лучина, в Гродненской области — самый низкий в стране показатель заболеваемости туберкулезом. В 2002 году он составлял 40,8 человек на 100 тысяч населения, тогда как по республике — 45,3. При этом, в области самый низкий показатель детской и подростковой заболеваемости туберкулезом. В прошлом году здесь заболели семеро детей и подростков, тогда как всего по республике — 78 человек.

"Туберкулез — это социальная болезнь, поскольку группы повышенного риска — это хронические алкоголики и лица, прибывшие из исправительных учреждений", — отметил главврач. В прошлом году, сообщил Дмитрий Лучина, в области от туберкулеза умерли 105 человек. Среди них более половины страдали алкоголизмом; бомжи составили 15 процентов; прибывшие из мест лишения свободы — 15 процентов.

Сегодня на учете в тубучреждениях Гродненской области состоят 1.598 больных туберкулезом.

Ирина ЧЕРНЯВКА

ГРОДНО

75-ЛЕТНЯЯ ЖЕНЩИНА ВЫПАЛА С БАЛКОНА

75-летняя женщина выпала с балкона собственной квартиры на 4-м этаже дома по улице Соломовой в Гродно.

Она получила переломы обеих бедер и скончалась через три часа после операции.

Это вторая жертва падения с высоты на этой неделе в областном центре. Накануне скончался на месте после падения с крыши 9-этажного дома по улице Врублевского 38-летний мужчина, живший в этом же доме на первом этаже.

Оба случая расследуются прокуратурой, возбуждены уголовные дела по статье "доведение до самоубийства".

Ирина ЧЕРНЯВКА

ВОЙТОВИЧ ВСТРЕТИЛСЯ СО СТУДЕНТАМИ И ПРЕПОДАВАТЕЛЯМИ

19 марта председатель Совета Республики Национального собрания Беларуси, академик Национальной академии наук Александр Войтович посетил Гродненский университет имени Янки Купалы.



Полтора часа он отвечал на вопросы 300 студентов и 170 преподавателей.

А.Войтович сообщил, что в ближайшее время у государства не будет резервов для повышения студенческих стипендий. На вопросы об экономическом положении страны председатель Совета Республики Национального собрания ответил, что при другой власти ситуация отличалась бы незначительно.

Академик одобрил ужесточение требований Высшей аттестационной комиссии (ВАК) при присвоении научных степеней. По словам А.Войтовича, это воспрепятствует девальвации звания ученого.

А.Войтович обещал содействие руководству университета при решении вопроса о расширении учебных площадей. Академик подарил университету книги. Ответным жестом стали акварель работы одного из студентов и учебник "История философии", ставший лауреатом республиканского конкурса учебников.

"Эта встреча принесла большую пользу в плане воспитания. Студенчество увидело, как просты, доступны, умны руководители нашего государства", — заявила в интервью БелаПАН проректор университета по учебно-воспитательной работе Татьяна Ботякова.

Ирина ЧЕРНЯВКА

ПРОБЛЕМА

СОКОЛОВО БЕЗ ВОДЫ

